*Роздум над кнігай*

Алена КРЫКЛІВЕЦ,
доктар філалагічных навук

# ДЫЯЛЕКТЫКА НАРОДНАЙ СВЯДОМАСЦІ Ў РАМАНЕ "ВАЙНА" УЛАДЗІМІРА ГНІЛАМЕДАВА

УДК: 821.161.3

Артыкул прысвечаны раману "Вайна" беларускага пісьменніка акадэміка У. Гніламедава. Празаік выяўляе асноўныя этапы эвалюцыі народнай свядомасці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, псіхалагічныя механізмы станаўлення і фарміравання партызанскага руху на Беларусі. Гэтаму садзейнічаюць сацыяльныя і ментальныя імплікацыі гістарычнай праўды, а таксама прыёмы міфалагічнай цытацыі. Прапануецца вызначэнне ключавой формы псіхалагічнага аналізу ў рамане – дыялектыка свядомасці.

Ключавыя словы: *сучасная беларуская літаратура, Вялікая Айчынная вайна, проза, раман, псіхалагічны аналіз, нацыянальны характар, дыялектыка свядомасці.*

The article is devoted to the novel "War" by the Belarusian writer, academician U. Gnilamedaw. The novelist reveals the main stages in the evolution of national consciousness during the Great Patriotic War, the psychological mechanisms of the formation of the partisan movement in Belarus. This is facilitated by the social and mental implications of historical truth, as well as techniques of mythological quotation. The article proposes a definition of the key form of psychological analysis in the novel – the dialectic of consciousness.

Ужо восем дзесяцігоддзяў пісьменнікаў савецкай і постсавецкай прасторы хвалюе тэма Вялікай Айчыннай вайны. Немагчыма пераацаніць подзвіг і гераічнасць савецкага народа, які пазбавіў свет ад карычневай чумы. Немагчыма ўсвядоміць жах і боль ад страты мільёнаў чалавечых жыццяў, разбуральныя наступствы глабальнай гуманітарнай катастрофы. Немагчыма прыняць і спасцігнуць сацыяльную і псіхалагічную сутнасць фашызму.

Проза пра Вялікую Айчынную вайну, створаная ў XXI ст., – гэта пераважна проза тых, хто не ваяваў. Яна вельмі разнастайная як у ідэйна-тэматычным, так і ў жанрава-стылёвым планах. У наш час у філалагічнай навуцы вылучаюць некалькі напрамкаў развіцця ваеннай прозы: гістарычны, анталагічны, экзістэнцыйны і эстэтычны [1; 3]. Да гістарычнага кірунку "адносяцца кнігі, дзе ваенныя падзеі ўпісаны ў гісторыю краіны і свету, прэтэндуюць на эпічны ахоп" [3, с. 8]. Характэрна, што пры ўсёй глабальнасці ваеннай трагедыі і магчымасці сёння карыстацца дакументальнымі крыніцамі маштабныя творы пра вайну нешматлікія. Традыцыі манументальнага эпічнага аповеду пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны, закладзеныя ў савецкай і постсавецкай літаратуры ("Жывыя і мёртвыя" К. Сіманава, "Яны змагаліся за Радзіму" М. Шолахава, "Трывожнае шчасце" І. Шамякіна, "Праклятыя і забітыя" В. Астаф'ева), у XXI ст. атрымліваюць працяг пераважна ў беларускай літаратуры. Іх рэцэпцыю мы назіраем у раманах "Вайна" У. Гніламедава і «Аперацыя "Кроў"» М. Чаргінца.

Уладзімір Васільевіч Гніламедаў – літаратуразнаўца, пісьменнік, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Яго раман "Вайна" – адна з шасці кніг цыкла пра жыццё беларускай вёскі Прускі, якая метанімічна ўвасабляе ўклад жыцця ўсёй Беларусі. Аналаг такой метажанравай канструкцыі ў рускай літаратуры – тэтралогія "Праслíны" Ф. Абрамава, першы раман якой "Браты і сёстры" таксама прысвечаны адлюстраванню ваенных падзей. Будучы адным з вядучых даследчыкаў гісторыі беларускай літаратуры XX ст., У. Гніламедаў у прозе акумуляваў і абагульніў эпічны вопыт І. Мележа, І. Шамякіна, найлепшыя традыцыі В. Быкава, Я. Брыля, А. Адамовіча і інш.

Пісьменніку важна не толькі і не столькі фактаграфічная дакладнасць у апісанні ваенных падзей (што адрознівае большасць твораў гістарычнага напрамку), колькі псіхалагічная праўда вайны, дакладнасць рухаў душы, разважанняў, учынкаў асобных персанажаў, а таксама маральныя заканамернасці ваеннага часу, якія вызначылі ментальную дынаміку беларускага і ўсяго савецкага народа.

У раманах-эпапеях, якія сталі знакавымі з'явамі свайго стагоддзя, задалі этычную і эстэтычную планку далейшага развіцця літаратуры ("Вайна і мір" Л. Талстога, "Ціхі Дон" М. Шолахава), максімальна аб'ёмна ўвасоблена нацыянальная ідэя, што і дазваляе называць іх эпапеямі. Пісьменнікі не толькі спрабуюць зразумець сутнасць нацыянальнага характару, не толькі маштабна адлюстроўваюць найважнейшыя для дзяржавы гістарычныя падзеі, але і дэманструюць эвалюцыю народнай свядомасці, кансалідацыю народа ў пераломныя гістарычныя моманты, выяўляюць якасці, якія характарызуюць нацыянальную свядомасць.

Можна меркаваць, што ў раманах "Вайна і мір" Л. Талстога, "Ціхі Дон" М. Шолахава, а таксама ў рамане "Вайна" У. Гніламедава (дзе прысутнічае "*мысль народная*") ключавую форму

псіхалагічнага аналізу варта вызначыць як *дыялектыку свядомасці*. Аўтары названых эпічных палотнаў ствараюць панараму грамадскага руху ў складаныя гістарычныя перыяды. Пісьменнікаў цікавіць светаразуменне герояў, эвалюцыя іх поглядаў на падзеі, якія адбываюцца, на сваё месца ў гістарычных умовах. Яны звяртаюць увагу на тое, як пад уздзеяннем рэалій новай рэчаіснасці змяняецца свядомасць герояў, як яны шукаюць і знаходзяць гуманістычныя арыенціры, апоры чалавечага духу, выказваюць веру ў духоўны патэнцыял, сілу і стойкасць народа.

У рамане "Вайна" У. Гніламедаў пашырае метанімічныя межы савецкай "акопнай" прозы, суадносячы індывідуальны маральны выбар героя з агульнымі псіхалагічнымі законамі вайны, не цураецца "нязручных" тэм, не абмяжоўвае індывідуальна-аўтарскі пошук сфарміраванымі клішэ і неабходнасцю быць карэктным у раскрыцці суровай, а месцамі непрывабнай праўды. Пісьменнік аднолькава далёкі як ад знарочыстага пафасу і наўмыснай гераізацыі персанажаў (што было ўласціва літаратуры першага пасляваеннага дзесяцігоддзя, дзе відавочна знайшла адбітак эйфарыя ад перамогі), так і ад дэгераізацыі ваенных падзей, якая выявілася ў экзістэнцыйным вектары развіцця "акопнай" прозы ў 60–70-я гг. мінулага стагоддзя. У. Гніламедаў пераканаўча паказвае, што немагчыма не адчуваць страху, рызыкуючы жыццём, што выкананне баявога задання – гэта пераадоленне сябе, у чым і заключаецца штодзённы подзвіг: "*У Косці моцна застукала сэрца. Лёгка сказаць – зазірніце. Зазірні і атрымаеш кулю ў лоб ці яшчэ ў якое-небудзь месца. Страшнавата!.. Але загад трэба выконваць*" [2, с. 213].

Аднак не ўсім удавалася мабілізавацца, выканаць воінскі абавязак і захаваць сябе. Вайна пераварочвае сістэму маральных каардынат, і лёгка збіцца са шляху. Страту чалавечых якасцяў у апошнія гады ўсё часцей вызначаюць як *расчалавечванне*. У. Гніламедаў глыбока, непрадузята аналізуе жудасную сутнасць вайны, якая разбэшчвае, прыводзіць да дэгуманізацыі. Пакутлівыя разважанні цэнтральнага героя рамана Лявона Кужаля звязаны з маральнай прыродай вайны, з прычынамі паўтаральнасці гэтай катастрофы ў гісторыі чалавецтва: "*– Міне колькі год – і вайна, пройдзе пару год – зноў вайна, – уздыхнуў Лявон. – Цікава, ці скончыцца гэта калі-небудзь?*" [2, с. 118]. Размова Лявона і Павала адлюстроўвае цяжкія роздумы аўтара пра светаўладкаванне, пра няздольнасць чалавецтва жыць у ладзе з самім сабой і з навакольным светам. Палітычныя амбіцыі, прага неабмежаванай улады, хцівасць зноў і зноў прыводзяць людзей да сацыяльнай і экзістэнцыйнай бездані.

Далёкія ад вялікай палітыкі, жыхары глухой беларускай вёскі Прускі тонка адчуваюць антычалавечую прыроду вайны, дакладна і проста яе вызначаюць: "*– Але дзіўная рэч, – парушыў маўчанне Калода, які і сам быў не надта гаваркі, – адзін чалавек ніколі другога не ведаў, і не бачыў, і не сустракаў, і вось у першы раз сустрэў і мусіць яго забіць, хоць да гэтага нічога дрэннага яны адзін другому і не зрабілі...*" [2, с. 137]. Глыбінная сумленнасць, далікатнасць і чалавечнасць нараджае ў беларускіх сялянах думкі пра недапушчальнасць, ненатуральнасць расчалавечвання, неабходнасці бачыць ворага ў іншым, незнаёмым чалавеку.

Аўтар рамана задаецца пытаннем, якія псіхалагічныя механізмы вайны прыводзяць да дэмаралізацыі і духоўнай дэградацыі? Асноўная прычына трансфармацыі масавай свядомасці, безумоўна, – страх. У іншыя моманты страх блакуе свядомасць, саступаючы месца інстынкту самазахавання: "*Страх, які валодаў людзьмі, стаў галоўным матывам іх паводзін. Больш за ўсё даймаў клопат, каб хоць як ацалець у гэты жорсткі, неміласэрны час*" [2, с. 399]. Натуральна, што далёка не кожны чалавек, чыя штодзённая задача на працягу некалькіх гадоў – выжыванне, – здольны клапаціцца пра сваё маральнае аблічча і маральныя прынцыпы.

На першы погляд не відавочная, але вельмі істотная прычына духоўнай дэградацыі на вайне – адарванасць чалавека ад родных каранёў, сям'і, звыклага ўкладу жыцця. Клопат пра дом, пра родных і блізкіх, духоўная сувязь з малой радзімай даюць глебу пад нагамі, адчуванне патрэбнасці і значнасці, у некаторых выпадках бытавая руціна нават дысцыплінуе. Пазбавіўшыся гэтага, чалавек нібы выпадае са звыклай сістэмы каардынат, не дзіўна, што страчвае і маральныя арыенціры: «*Камандзір між тым рабіўся ўсё больш заклапочаным. Бачыў, як людзі, асабліва "ўсходнікі", цяжка перажывалі адзіноту, адарванасць ад сем'яў, ад родных краёў, родных каранёў. Гэта рабіла іх пасіўнымі, маларухомымі і абыякавымі... Людзі, чаго добрага, апусцяцца, забудуць, хто яны, дэмаралізуюцца. Чалавек, што і казаць, да гэтага схільны. Тады канец...*» [2, с. 140]. Такую непрывабную, але псіхалагічна дакладную праўду пра вайну адважваліся выказаць не ўсе прадстаўнікі ваеннай прозы. У. Гніламедаў дае трапныя характарыстыкі прычын і наступстваў псіхалагічных трансфармацый сваіх герояў, раскрывае іх знешнюю і ўнутраную дэтэрмінацыю.

Далёка не ў кожнага ў цяжкі гістарычны перыяд атрымалася не зламацца. Таму, імкнучыся ўзнавіць усе маральныя перыпетыі, У. Гніламедаў адзначае, што нярэдка ў ваенныя гады людзі ішлі па шляху маральных памылак і страты

ідэалаў: тое, што раней было табуяваным, цяпер аказалася штодзённым і нармальным. Пра гэта сведчыць, напрыклад, згадка пра разрабаванне яўрэйскай крамы пасля знішчэння брэсцкага гета: «*Васіль успомніў таго паліцая, што заходзіў у Мірыкаву лаўку, і яго гамонку: "Хутка будуць вывозіць, у шапку не спі". Цяпер ён зразумеў, што стаяла за гэтай фразай – у шапку не спі! Той-сёй чакаў гэтай часіны канца яўрэйскага гета, каб пакарыстацца пакінутым дабром*» [2, с. 328].

Не хавае У. Гніламедаў і таго, што ўседазволенасць у ваенны час адчулі не толькі маральна дэзарыентаваныя абывацелі, але і некаторыя прадстаўнікі каманднага складу, якіх разбэсціла адчуванне ўласнай значнасці і ўлады над падначаленымі: «*Не сказаў толькі аб тым выпадку пры пасадцы, калі палкоўнік Сцяпан пхнуў нагой хлапчыну-радыста, не ўзяўшы з сабой у нямецкі тыл, і пра тое, што палкоўнік, калі ўжо ўсталёўваўся на новым месцы, пажадаў абшыць сваю зямлянку парашутным шоўкам: "Каб утульней было, госці, здараецца, заходзяць..."*» [2, с. 417].

Безумоўна, раман "Вайна" актуалізуе традыцыі экзістэнцыйнага вектара развіцця савецкай ваеннай прозы, дзе каталізатарам канфлікту станавілася сітуацыя маральнага выбару, перад якім аказваўся герой. Раскрываючы агульныя псіхалагічныя заканамернасці ваенных рэалій, пісьменнік падкрэслівае і вагу індывідуальнага маральнага выбару, які вызначаўся наяўнасцю або адсутнасцю духоўных асноў у канкрэтнай асобы. Расчалавечванне – доля тых, хто пазбаўлены маральных асноў: «*Калісьці даўно брэсцкі ўніяцкі мітрапаліт Пацей сказаў пра вайну, што яна "выварочвае грунт" пад нагамі людзей, і меў рацыю. Атрымалася так, што сярод такіх людзей аказаліся і Свісціян з Маркелам, якія і да таго слаба адчувалі грунт пад сабою, найперш грунт маральны, а цяпер наогул яго пазбавіліся. Як бы яго ніколі і не было*» [2, с. 278].

Уладзімір Гніламедаў стварае падрабязны псіхалагічны партрэт асобы, здольнай на здраду, на адрачэнне ад сваіх каранёў і аднавяскоўцаў. У паліцаі ішлі не толькі з-за страху за сябе і за сям'ю. Памагатымі немцаў станавіліся нікчэмныя людзі, якія імкнуліся да ўлады, прагнулі самасцвердзіцца за кошт іншых: "*Хрысан зрабіў яшчэ адзін крок у сваім жыцці – крок да ўлады. Гэта зразумелі ўсе, а найбольш адчуў сам Хрысан. Ён даўно гэтага чакаў. Савецкая ўлада яго быццам і не крыўдзіла, але пры Саветах, калі арганізавалі рэўкам, яго ў той рэўкам не ўзялі, праігнаравалі, ён сцярпеў, праглынуў крыўду. І вось часы памяняліся. Цяпер у яго было нейкае яшчэ неўсвядомленае жаданне заняць пры новых парадках такое месца, каб адыгрsignifica, адпомсціць за тое, што раней яго не заўважалі і недаацэньвалі*" [2, с. 41].

Больш складаны і драматычны шлях Свісціяна, які і ў даваенным жыцці не меў маральнай апоры (нягледзячы на наяўнасць сям'і і гаспадаркі), а адчуванне беспакаранасці і надзея на тое, што "вайна ўсё спіша", зусім ператвараюць яго ў звера. У. Гніламедаў дэталёва прасочвае жахлівы шлях расчалавечвання. Вылучаючы этапы маральнай дэградацыі героя, пісьменнік выкарыстоўвае прыёмы псіхалагічнага паралелізму. Так, даведаўшыся пра гібель жонкі, Свісціян сыходзіць у лес. Інстынкт самазахавання прымушае яго акапацца ў гушчары. Гэтаму папярэднічае сцэна лоўлі рака, які ўсімі сіламі спрабуе выратавацца: «*Свісціян бачыў, як ён сутаргава працаваў хвастом і клешнямі, імкнучыся хутчэй унікнуць небяспекі. "Кожны хаваецца па-свойму", – падумаў Свісціян, зноў насыпаў вядро і аднёс у ручаіну*» [2, с. 112]. Падобна, па-звярынаму, рые сабе нару і сам Свісціян. У. Гніламедаў нібы імкнецца зразумець псіхалогію "іншага", вызначыць, што прыводзіць чалавека да страты чалавечых якасцяў.

Логіка экзістэнцыйнага напрамку развіцця ваеннай прозы ў другой палове XX ст. і на сучасным этапе неаднаразова ўказвала на тое, што вайна духоўна спусташае чалавека, фарміруе своеасаблівую "звычку" да болю, які ў сваю чаргу прыводзіць да страты чалавечых каштоўнасцяў, маральных арыенціраў, да бязмежнай душэўнай стомленасці, і выхадам бачыцца толькі смерць: "*Стаміўся чалавек, ад вайны стаміўся, – думаў пра Дзімку Косця, – сам сабе шукаў смерць. Шукаў і знайшоў...*" [2, с. 362]. Адлюстроўваючы працэс расчалавечвання на вайне, У. Гніламедаў не мае на мэце абясцэніць чалавечую асобу: пісьменнік паказвае, наколькі складанымі былі выпрабаванні ваеннага часу, які цяжкі шлях прайшло ваеннае пакаленне да Перамогі.

Як і ў творах папярэднікаў, у рамане У. Гніламедава ўздымаецца пытанне пра апоры чалавечага духу, пра тое, што ж дапамагала выжыць і выдужаць нават у самых страшных умовах: "*Жыццё, здавалася, ужо нічога не каштавала, хацелася аднаго: паваліцца на зямлю і не ўставаць. Але ёсць, відаць, у чалавеку нешта мацней за яго самога. Магчыма, яно і дазваляе трываць. Што гэта такое? Бог, прырода, памяць, гены? Цяжка сказаць, аднак выходзіць, што чалавек – істота моцная, трывушчая, і ён церпіць, жыве, нават у самых невераемных умовах*" [2, с. 374].

У творчасці шэрага савецкіх пісьменнікаў, якія суадносіцца з парадыгмай "вясковай" прозы, гучыць думка, што галоўнай асновай сялянскага жыцця, ключавой яго каштоўнасцю выступаюць зямля-карміцелька і стваральная праца на

зямлі. Ва ўнісон гучаць і разважанні прускаўскіх сялян Лявона Кужаля і Якава Арыстархавіча: "*То Расія, то Польшча, то Саветы, то немцы, – так вось і жывём. Жыццё на месцы не стаіць.*

*– Нам гаспадаркі трымацца трэба, – сказаў Лявон... – хлеба ніхто не дасць.*

*– Правільна! Гаспадаркі трэба трымацца!*" [2, с. 33].

Зямля, якая змяшчае ў сабе ўсю глыбіню і мудрасць прыроднай эсхаталогіі, дае надзею на працяг жыцця, на адраджэнне нават пасля сур'ёзных узрушэнняў. Сялянскі ўклад, пераемнасць пакаленняў, "спрадвечная справа" жыцця набываюць і ў творчасці пісьменнікаў-"вяскоўцаў", і ў рамане У. Гніламедава сакральны сэнс, выступаюць асновай духоўнага ачышчэння і адраджэння: «*Лявону думалася: "Усё гэта – і дзядуля, і ветах, і дождж, і раса на траве, і Камянецкі стоўп – усё гэта адзін ланцуг жыцця, якое працягваецца, плыве з мінулага ў будучыню і валодае нейкай дзіўнай неадольнай і ўсёпераможнай сілай, перад якой, пэўна, ніхто і нішто не можа ўстаяць"*» [2, с. 64].

Акумуляцыя маральных каштоўнасцяў у паўсядзённым жыцці сялянства цесна звязана з духоўнай апорай на праваслаўе, што падкрэсліваецца ў некаторых сцэнах рамана "Вайна". Адпраўляючы свайго "пастаяльца" ў лес да партызанаў, Фёкла надзявае на Саньку крыжык і бласлаўляе яго. У самыя цёмныя часы жыхары Прускі згадваюць традыцыю ставіць крыж для абароны ад бяды. Менавіта вера становіцца той апорай чалавечага духу, якой у вайну так не хапала.

У эпічным раманным палатне пытанне пра маральны выбар канкрэтнай асобы натуральна перарастае ў разважанні пра духоўны шлях усяго народа, пра эвалюцыю народнай свядомасці. Вёска Пруска становіцца своеасаблівай метаніміяй беларускага народа. На прыкладзе яе жыхароў пісьменнік паказвае, як пашыраюцца межы народнай свядомасці, як непазбежна перад тварам трагедыі надыходзіць усведамленне асабістай бяды, асабістага шляху – як часткі агульнанацыянальнага гора і гістарычнага шляху ўсяго савецкага народа.

Трывожнасць першых дзён вайны штурхала людзей адно да аднаго: раіцца, дзяліцца перажываннямі, шукаць адказы на пытанні. Такую інстынктыўную статкавасць Свіцціян саркастычна параўноўвае з паводзінамі ракаў: "*– Дурныя, як і людзі, – думаў Свіцціян. – Разам хочуць трымацца, усё адно як сляпыя. Ёлупні. Разам, ліха іх матары, паўзуць у пастку*" [2, с. 115].

Аўтар рамана "Вайна" нібы расстаўляе вехі на шляху станаўлення народнай самасвядомасці. Ён падкрэслівае, як паступова страх, які збіваў людзей у гурт у пачатку вайны, саступае месца агульнай мэце – супольнай працы, выжыванню, імкненню адолець ворага: "*Агульная бяда і агульная мэта хутка згуртоўваюць людзей. Гэта можна было бачыць па тым, як яны працавалі*" [2, с. 132]. Робячы псіхалагічныя абагульненні, У. Гніламедаў не сумняваецца ў сумленнасці беларускага народа, які нават у цяжкія часы не здольны паквапіцца на чужое, нашкодзіць агульнай справе: "*А па-другое, хто з сялян, калі б нават і адкрыў хоць адзін з гэтых складаў, ніколі б не адважыўся адбіраць у партызан харчы, асуджаючы іх на голад*" [2, с. 381]. Гібель вёскі Лескі і яе жыхароў успрымаецца прускаўцамі як асабісты боль. Дасціпны выраз "мая хата з краю", якім нярэдка характарызуюць залішнюю разважлівасць беларусаў, набывае ў рамане іншае значэнне. Яскравы прыклад – хата Васіля Платонава на ўскрайку вёскі. Васіль апынуўся бліжэй за ўсіх да лесу, ён трымае сувязь з партызанамі, пакутуе ад набегаў Свіцціяна, нават трапляе ў лапы гестапа. Такім чынам, "хата з краю" становіцца своеасаблівым сінонімам "дома ля дарогі" (як у аднайменнай паэме А. Твардоўскага) – ён першым сустракае любыя перамены і выпрабаванні.

Весткі пра спаленыя вёскі ўзрушвалі жыхароў Прускі, але не пазбаўлялі чалавечых якасцяў: разважлівасці, узаемадапамогі, жыццеўстойлівасці. Нягледзячы на пастаянную пагрозу жыццю, Лявон і аднавяскоўцы паводзяць сябе так, як загадвае ім сумленне: "*– Правільна ты зрабіў, чалавеча! Лясным людзям трэба дапамагаць. Барацьба ідзе не на жарт. Ад яе не схаваешся, не абмінеш. А зброя трапіла па адрасе, па прызначэнні. Там яна прыдасца і будзе карыснай. Што ж, хай і твая кропля дапамогі зробіць сваю справу, каб прагнаць гэтых гітлераўскіх прыхадняў. Калі зброя ў руках, дык яна ўжо абавязкова стрэліць...*" [2, с. 244–245]. Вайна кансалідуе грамадства перад тварам вонкавых захопнікаў. Змяняюцца ўяўленні пра апазіцыю *свой – чужы*, у мінулае сыходзяць класавыя супярэчнасці. У. Гніламедаў не абмінае гістарычнай праўды, калі паказвае, што былы вязень супрацоўнічае з начальнікам НКУС у імя агульнай справы, "ідэалагічныя апаненты" перастаюць імі быць: "*Упаўнаважаны нічога яму на гэта не сказаў, паглядзеў у бок пагорка і моўчкі працягнуў руку. Фальварковец падаў яму сваю вялікую пульхную далонь. І з Мурашкам развітаўся за руку*" [2, с. 319].

Відавочна, што імкненне У. Гніламедава адлюстраваць "народную" вайну адрозніваецца ад папулярнай у канцы мінулага стагоддзя (напрыклад, у рамане "Праклятыя і забітыя" В. Астаф'ева) пазіцыі: апісаць супрацьборства простых людзей і дзяржаўнай сістэмы ў кан-

тэксце кровапралітнай вайны. Беларускі пісьменнік дэманструе станаўленне народнага духу, умацаванне народнага адзінства і веры ў сілу савецкага войска: "*Расія не аслабела, – запярэчыў яму Мачалаў. – Наадварот, Расія больш моцнай стала. Гэта Сталінград паказаў. Далі па карку!*" [2, с. 408]. Варта дадаць, што сутнасць дыялектыкі народнай свядомасці ў рамане "Вайна" заключаецца ў эвалюцыі ад *статкавасці* да *сабornасці*, ці, карыстаючыся паняццямі Л. Талстога, ад *натоўпу* да *народа*, у чым максімальна ярка выяўляецца нацыянальная ідэя рамана.

Такая логіка бачыцца і ў апісанні У. Гніламедавым станаўлення партызанскага руху ў Беларусі. Празаік адкрыта паказвае, што прычыны пайсці ў лясы ў людзей бывалі розныя, часам далёкія ад патрыятызму і жадання змагацца з ворагам, абараняючы Радзіму. Нярэдка гэта было адзінае выйсце ў крытычных абставінах (у акружэнцаў, вязняў канцлагераў). І на пачатку "лясныя жыхары", якія глынулі гора і страху, не спяшаліся дэманстраваць ратныя ўменні, чакалі: "*– Без толку лезці на ражон не трэба! – дадаў камандзір… – Паглядзім, што да чаго, а тады падумаем. Спяшацца не выпадае*" [2, с. 257]. У першыя гады вайны апынуліся сярод "насельнікаў лесу" і злачынныя элементы, якія спрабавалі скарыстацца сітуацыяй у карыслівых мэтах, нажыцца на чалавечай бядзе, а пазней – схавацца ад правасуддзя. Станаўленне асабістай і народнай самасвядомасці адбывалася не аднамомантна, яе неабходна было вынасіць і выпакутаваць – і тады паняцці прысягі і воінскага абавязку станавіліся не пустым гукам, набывалі значнасць: "*– Ведаю, але трэба. Разумееш? Трэба! Мы ж людзі ваенныя, наша дзела – вінтоўку ў руках дзяржаць…*" [2, с. 329].

Гістарычная і экзістэнцыйная праўда, паводле У. Гніламедава, такая, што першапачатковая матывацыя баявых вылазак першых, яшчэ не арганізаваных партызанскіх груп была далёкая ад ідэалізаванай літаратурнай версіі. Знясіленымі, галоднымі і хворымі людзьмі, якія хаваліся па лясах, рухалі не гераічнасць і жаданне подзвігу, а блізкасць фізічнага і маральнага падзення, небяспека дэмаралізацыі, гатоўнасць загінуць, абы не весці ганебнае існаванне: "*– Не, таварышы, – аднойчы раніцай сказаў, выйшаўшы з будана, Калеснікаў, кашляючы і пазіраючы сабе пад ногі. Вейкі і бровы яго пакрыліся марознай шэранню, – лепш памерці ад варожай кулі, чымсьці ад голаду і холаду. Хай яно здохне – такое жыццё!*" [2, с. 375].

З часам да цяжкіх умоўляснога жыцця далучылася і пачуццё віны перад мясцовымі жыхарамі, якія кармілі і забяспечвалі партызан. Іх давер і свае лясныя тулянні неабходна было апраўдваць дзеяннямі: "*Нешта канкрэтнае трэба рабіць! – разважалі паміж сабой камандзір і камісар. – А то застанемся ў чалавечай памяці нейкімі ляснымі тулягамі ды і ўсё на гэтым*" [2, с. 368]. Акрамя таго, карныя аперацыі фашыстаў у вёсках, чые жыхары супрацоўнічалі з партызанамі, усклалі на ўдзельнікаў партызанскіх фарміраванняў груз маральнай адказнасці, паказалі, якую рызыку зазнае мірнае насельніцтва на акупаваных тэрыторыях, паспрыялі поўнай і пераканаўчай трансфармацыі "насельнікаў лесу" ў народных мсціўцаў.

Выпраўляючыся на баявыя аперацыі пры відавочным недахопе людзей і зброі, страчваючы таварышаў, перажываючы нягоды, партызаны атрымліваюць важны і патрэбны досвед вайны ў тыле ворага, пачынаюць верыць у свае сілы, усведамляюць неабходнасць унёску ў справу барацьбы з фашысцкімі захопнікамі. У партызан не застаецца сумневаў, што "*з фашызмам трэба змагацца да канца*" [2, с. 344]. Такім чынам, гісторыя станаўлення партызанскага руху ў рамане "Вайна" У. Гніламедава – гэта апісанне асноўных псіхалагічных прычын і этапаў фарміравання з асобных, нярэдка дэмаралізаваных людзей і невялікіх атрадаў паўнавартаснай баяздольнай арміі, гатовай абараняць свой народ, – метанімічны спосаб адлюстравання дыялектыкі народнай свядомасці.

Цалкам відавочная ў ваенны час апазіцыя *свой – чужы* асэнсоўваецца ў рамане У. Гніламедава з нечаканага ракурсу і набывае экзістэнцыйнае гучанне. Пісьменніка цікавяць не палітычныя, не ідэалагічныя, а псіхалагічныя супярэчнасці (нацыянальна-ментальныя адрозненні) беларусаў і немцаў (а таксама іх паслугачоў – жыхароў Усходняй Прусіі, палякаў, прыбалтаў). З дробных дэталяў складаюцца падрабязныя псіхалагічныя партрэты. Як толькі да Прускі дакаціліся навіны пра вайну, адныя з першых адчулі ўсёдазволенасць і прыйшлі граміць мясцовую лавачку так званыя каланісты, якія гадоў дзесяць таму прыйшлі з-за Буга і пасяліліся па суседстве з Пruскай. Мясцовае насельніцтва назірала за імі ў здранцвенні і нерашучасці: «*Ашалелы люд кінуўся ў магазіннае нутро. Выносілі хто што: скрынкі з кансервамі, мануфактуру, цукар, соль, махорку, пернікі, запалкі… Кучэўскі выйшаў з хамутом на шыі. Магазін расцягнулі ў імгненне. Клюкоўскі з Касаралам не падзялілі кавалак нейкай палатніны і зацята яго рвалі і цягнулі кожны на свой бок. "Гэтыя з-за Буга куды смялей за нашых!" – са здзіўленнем думаў Міцька,назіраючы чалавечыя жарсці*» [2, с. 11]. Страх за сваё жыццё і за лёс блізкіх не перашкодзіў беларускім сялянам трымаць сувязь з партызанамі, пускаць у хаты

і прыкрываць акружэнцаў, дапамагаць людзям у бядзе. Чаго нельга сказаць пра насельніцтва Усходняй Прусіі, якое не проста адмаўляла збеглым вязням фашысцкіх канцлагераў у схованцы, але і здавала іх у паліцэйскія ўчасткі.

Характэрна, што менавіта вачыма жыхароў Прускі бачыцца вобраз *чужога*, які нясе небяспеку, разбурэнні і смерць: "*Люльке выгляд меў такі ж, як і ў першы раз: фуражка з высока задраным верхам, на носе пенснэ, пояс на адвіслым жываце адцягвала цяжкая кабура, але ў руках трымаў ужо не стэк, як звычайна, а пругкую гумавую палку... Але чамусьці болей за ўсё ўсіх страшылі яго высокая, ажно заломленая назад фуражка і бліскучае пенснэ на носе як увасабленне нейкай вышэйшай і канчатковай сілы*" [2, с. 279]. Героі У. Гніламедава, гледзячы ў твар небяспецы, здольныя даць маральную ацэнку дзеянням захопнікаў, абапіраючыся на народную мудрасць і векавыя маральна-духоўныя каштоўнасці: "*– У немцаў, я чуў, ногі тоненькія-тоненькія, а душа – кароткая! Дык што ж вы хочаце? Таму яны і злыя такія. Усё, калі добра падумаць, проста*" [2, с. 111]. Пры гэтым свядомасць беларускага народа не здольная змясціць тую ступень жорсткасці, якую прадэманстравалі гітлераўцы на беларускіх землях, назва якой – фашызм. Трагічныя весткі пра карныя аперацыі ў суседніх вёсках успрымаюцца прускаўцамі нават з пэўным недаверам да таго, што людзі здольныя так абыходзіцца з іншымі людзьмі.

З непадробнай увагай, любоўю і гонарам рэканструюе У. Гніламедаў беларускі нацыянальны характар. Аўтар не абмінае ўвагай славутую беларускую "памяркоўнасць", гатоўнасць у складаных умовах "*пачакаць, пацярпець, а там ужо як лёс распарадзіцца*" [2, с. 290]. Аднак у гэтай разважлівасці ёсць і імкненне разабрацца ў сітуацыі, не зрабіць памылку, і недавер да ўсяго знарочыстага, да любой лозунгавасці, ад каго б яна ні зыходзіла, і апора на ўласны здаровы сэнс: "*Лявон з Фёклай дзівіліся, хіталі галовамі, хоць поўнай веры не давалі, бо ў лістоўцы адчуваліся прапагандысцкія намеры аўтараў. У вялікіх, ужо не цёмна-блакітных, а крыху выцвілых вачах Фёклы адлюстраваліся і надзея, і трывога*" [2, с. 230]. Міралюбнасць, добразычлівасць, гасціннасць і ўзаемадапамога характарызуюць галоўных герояў рамана, а ў іх, як у люстэрку, адбіваецца ментальнасць беларускага народа. Гісторыя вёскі Лескі становіцца ў рамане "Вайна" не толькі "знакам бяды", але і сімвалам маральнай стойкасці і нязломнасці беларусаў. Слушна сцвярджае літаратуразнаўца В. Русілка: «У рамане "Вайна" У. Гніламедаў даследуе важныя рысы нацыянальнага беларускага характару, што выявіліся ў крытычны для нацыі момант: трываласць, цярплівасць, душэўнасць, ахвярнасць, пасіянарнасць і саборнасць» [4, с. 161].

Як недаступнымі для разумення беларусаў былі зверствы фашыстаў, так незразумелымі захопнікам падаваліся вытокі духоўнай сілы і мужнасці славян – у гэтым, паводле У. Гніламедава, і заключаюцца непрымірымыя супярэчнасці, у гэтым бачыцца пісьменніку аснова апазіцыі *свой – чужы*: «*Апошнім часам амтскамісар часта знаходзіўся ў одуме, не мог зразумець: "Мы ж пакарылі гэты народ, – разважаў ён, – чаму ж ён да гэтага часу супраціўляецца, не даецца, каб мы, на праве пераможцаў, уладарылі? Да славян не можа быць літасці! Гэтыя людзі непрадказальныя. Невядома, чаго можна ад іх чакаць..."*» [2, с. 365]. У адказ нямецкаму афіцэру гучыць вычарпальная самахарактарыстыка жыхароў Прускі: "*Нас можна заваяваць, але намі цяжка ўладарыць. Мы славяне, а гэта – іншае. Мы быццам і ціхія, але і скрозь камень праб'емся*" [2, с. 42].

У мастацкай спробе рэпрэзентаваць нацыянальны характар беларусаў палягае міфалагічная ўмоўнасць рамана. Сімвалізм твора апелюе да пантэістычных і татэмных уяўленняў. Ключавыя міфалагемы рамана "Вайна": ссечаныя фашыстамі вішня, груша і белавежскія дубы, якія адсылаюць да архетыпа сусветнага дрэва, культавыя для беларускай фальклорна-міфалагічнай свядомасці бусел, Камянецкая вежа. Гэтыя вобразы пераканаўча дэманструюць сувязь беларускага народа з каранямі, гатоўнасць змагацца за гістарычнае права жыць на сваёй зямлі.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што раман "Вайна" Уладзіміра Гніламедава ўяўляе сабой першы нацыянальна арыентаваны беларускі раман пра вайну, асноўнай задачай якога становіцца мастацкае асэнсаванне нацыянальнага характару і эвалюцыі нацыянальнай свядомасці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Вырашэнню гэтай кагнітыўнай задачы спрыяюць сацыяльныя і ментальныя імплікацыі гістарычнай праўды, разнастайныя метады і прыёмы псіхалагічнага аналізу, семантычна абгрунтаваныя спосабы міфалагічнай цытацыі.

**Спіс літаратуры**

1. **Аристов, Д. В.** "Окопная правда" – вчера и сегодня / Д. В. Аристов // Филологический класс. – 2010. – № 23. – С. 30–36.

2. **Гніламёдаў, У. В.** Вайна : раман / У. В. Гніламёдаў. – Мінск : Беларус. навука, 2014. – 628 с.

3. **Ковтун, Н. В.** Тема памяти в современной прозе о Великой Отечественной войне / Н. В. Ковтун // Культура и текст. – 2020. – № 4. – С. 6–24.

4. **Русілка, В. І.** Беларускі нацыянальны характар у рамане У. Гніламёдава "Вайна" / В. І. Русілка // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XXII (69) Региональной науч.-практ. конф. преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, Витебск, 9–10 февраля 2017 г. : в 2 т. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2017. – Т. 1. – С. 161–162.